# Падзеі і здарэнні за тыдзень




**ЗАГСам** зарэгістраваны па раёне чатыры шлюбы і зроблены тры адзнакі аб скасаванні сямейнага саюзу. Пасведчанні аб нараджэнні атрымалі пяць маленькіх жыхароў Стаўбцоўшчыны: Дарына Пракапец, Васіліса Ярмак, Анастасія Волкава, Мірра Курыла і Эрдэм Йылдырым.

**Пракуратурай раёна** ў ходзе нагляду за выкананнем заканадаўства выяўлены парушэнні на малочнатаварных фермах ААТ «Агранёманскі», ААТ «Шашкі», ААТ «Дзераўное», ААТ «Рочавічы», ААТ «Радзіма Дзяржынскага», у выніку чаго кіраўнікам гэтых сельгаставарыстваў вынесены прадпісанні. Галоўнаму ветэрынарнаму ўрачу раёна дадзена даручэнне аб прыцягненні вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці.

**У пажарнай часці** паведамілі пра пажар у жылым доме ў вёсцы Ахрэмавічы, дзе ў ходзе тушэння быў знойдзены загінулы — 53-гадовы мужчына. Прычына здарэння высвятляецца. На месца выязджала следча-аператыўная група. Матэрыялы праверкі перададзены ў раённы аддзел Следчага камітэта.

**Міліцыяй** узбуджана крымінальная справа ў адносінах да жыхара Мінскага раёна, які з дома ў Кнотаўшчыне выкраў музычны цэнтр коштам 100 рублёў. Невядомы пранік на тэрыторыю ВГУП «Гном-сэрвіс» у г. Стоўбцы і вынес са складскіх боксаў кіслародныя і газавыя балоны, электрарухавікі і інш.

**Суд** аштрафаваў на чатыры базавыя велічыні  работніцу адной з МТФ раёна  — за паўторнае знаходжанне на рабочым месцы ў стане алкагольнага ап’янення.

**ДАІ** выявіла 68 парушэнняў правілаў дарожнага руху. Сярод парушальнікаў — два п’яныя вадзіцелі і сем вадзіцеляў-бяспраўнікаў, 12 недысцыплінаваных пешаходаў. З 15 па 19 лютага на дарогах якраз праходзіла акцыя «Пешаход». Зарэгістравана 16 ДТЗ, пераважна ва ўсіх аварыях вадзіцелі не справіліся з кіраваннем ва ўмовах снегападу. Ніхто не пацярпеў.

**«Хуткая»** атрымала 238 выклікаў да хворых.

**Падрыхтавала Таццяна ПЯТКЕВІЧ**